

**Пісарэнка Алена Міхайлаўна**
Кандыдат філалагічных навук, дацэнт,
загадчык кафедры беларускай і замежнай філалогіі
Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта
культуры і мастацтваў

УДК 378.4:[008+7](476-25):82.02(091)

*А. М. Пісарэнка*

# Ад каліва да «БУКета»: гістарыяграфія літаратурнага аб'яднання ўніверсітэта

*На аснове вопыту работы літаб'яднання Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў «БУКет» разглядаюцца актуальныя задачы сферы сучаснай адукацыі: выяўленне таленавітай моладзі, развіццё і ўдасканаленне яе творчага патэнцыялу ў літаратурнай дзейнасці. Адлюстравана апублікаванасць твораў паэтычнага, празаічнага і драматургічнага характару ўдзельнікаў аб'яднання, апісаны ўдзел студэнтаў ва ўніверсітэцкіх, рэспубліканскіх і міжнародных літаратурных конкурсах. Канцэпцыя артыкула будуецца на перакананні ў тым, што літаратурная праца маладых аўтараў з'яўляецца адным са спосабаў пазнання рэчаіснасці і сродкам самавыражэння асобы праз мастацкія вобразы.*

*Расці, каліва! Расці высока,*
*Расці шчасліва! Расці, каліва,*
*Людзям добрым на добрае дзіва.*
*Расці, каліва! Станавіся кветкаю,*
*Каб з тае кветкі выраслі дзеткі…*
*Расці, каліва! Хлопцы, дзяўчаты*
*Кветкі збяруць – кветкі збяруць,*
*У "БУКет" складуць… Расці, каліва!*
*А. Багамолава*

«Каліва» – назва чацвёртага зборніка твораў удзельнікаў літаратурнага аб'яднання Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў, які пабачыў свет у 2005 г. Калі разглядаць значэн-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

не слова «каліва» як парастак расліны, пачатак яе жыцця, то і для нас гэта быў пачатак літаратурнага працэсу: невялікія па аб'ёме зборнікі, аўтараў няшмат. Аднак каліва расло, давала жыццё іншым парасткам і пераўтваралася ў букет («БУКет»). Дарэчы, гэтую назву прыдумалі студэнты факультэта інфармацыйна-дакументных камунікацый (ФІДК). Першыя тры вялікія літары – абрэвіятура назвы нашай установы на момант утварэння гуртка: Беларускі ўніверсітэт культуры. У 2001 г. загадчык кафедры В. А. Гуліцкая, члены Саюза пісьменнікаў Беларусі А. М. Пісарэнка (паэтэса Алена Багамолава) і Н. В. Дзянісава (літаратурны крытык Наталля Якавенка) абмеркавалі творы студэнтаў, якія прынесла намеснік дэкана бібліятэчнага факультэта А. І. Фядорына. З 2004 г. у працу ўключылася В. В. Шунейка (старшы выкладчык), апошнім часам – В. С. Варапаева, Л. І. Даніленка. Восенню 2008 г. аб'яднанне пераведзена на студэнцкае самакіраванне, да 2014 г. кіраўніком быў студэнт, затым выпускнік ФІДК, супрацоўнік аддзела менеджменту П. Макееў, а літаратурным кансультантам «БУКета» стала С. М. Тычына, у 2010–2014 гг. гэтыя абавязкі выконвала В. Ч. Гронская.

На пасяджэннях «БУКета» студэнты і выкладчыкі зачытваюць і абмяркоўваюць творы, наладжваюць палеміку, рыхтуюць тэарэтычныя паведамленні, прысвечаныя цікавым літаратурным з'явам і працэсам, новым літаратурным жанрам, формам, арыгінальным вобразам і г. д. Вершы і апавяданні студэнтаў з'яўляюцца пачаткам далейшай складанай працы, абавязковы элемент якой – літаратурная вучоба, знаёмства з творчай пісьменніцкай лабараторыяй. Маладыя літаратары спрабуюць сябе ў розных мастацкіх жанрах, шукаюць сродкі выказаць асабістыя перажыванні, пачуцці з да-




Вітаю цябе, Натхненне!: матэрыялы па стылістыцы і культуры маўлення / уклад.: А. Багамолава [і інш.]. – Мінск: БДУКМ, 2015. – 138 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ




Жыву: матэрыялы па стылістыцы і культуры маўлення / склад.: А. Багамолава [і інш.]. – Мінск: БДУКМ, 2017. – 140 с.




Апошні дзень лета: матэрыялы па стылістыцы і культуры маўлення / уклад.: А. Багамолава, В. Шунейка. – Мінск: БДУКМ, 2019. – 156 с.

памогай тропаў і стылістычных фігур, цікавых і адметных асацыяцый.

Мастацкі тэкст – феномен чалавечай думкі, вобразна-асацыятыўнага мыслення, адзін з арыгінальных спосабаў самавыражэння асобы, які можа стаць крыніцай натхнення пры стварэнні вобразаў сродкамі іншых відаў мастацтва: жывапісу, тэатра, кіно і г. д. Літаратурныя творы становяцца асновай для напісання музыкі, лібрэта, песень і інш. Тэкст можа ўзнікнуць як вынік натхнення, атрыманага пасля наведвання тэатра, мерапрыемстваў, што ладзяцца творчымі кафедрамі ўніверсітэта, карціннай галерэі, прагляду кінафільмаў. Магчыма, таму літаратурная творчасць ахапіла ўсе факультэты ўніверсітэта і стала яшчэ адным сродкам самавыражэння нашых студэнтаў.

Літаратура дапамагае выпрацаваць ідэал паводзін, эстэтычны густ, духоўную культуру асобы. Сённяшні студэнт – гэта не толькі начытаны чалавек, ён можа быць аўтарам музычных твораў, харэаграфічных кампазіцый, дасканала валодаць словам вобразным і нявобразным, каб ацаніць змест песень, якія спявае сам ці якім акампануе. Сучаснікі не павінны абясцэньваць ролю слова ў выхаванні чалавека, у спасціжэнні жыцця, у самарэалізацыі творчай і гарманічнай асобы. На гэта робіцца акцэнт на ФІДК і на кафедры беларускай і замежнай філалогіі, пры якой існуе літаратурна-творчае аб’яднанне «БУКет». На сустрэчах аб’яднання студэнты вучацца будаваць дыялогі, талерантна абмяркоўваць творы адзін аднаго, удасканальваць змест і форму ўласных твораў. Творчая дзейнасць такога кшталту садзейнічае выхаванню рознабакова развітой, маральна сталай асобы, фарміраванню такіх якасцей, як узорнае маўленне, эстэтычная ўспрымальнасць, уважлівае стаўленне да літаратурнага і гутарковага слова.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Намаганнямі літаб'яднання выдадзена 12 зборнікаў вершаў і прозы: «БУКет» (2002), «Акварэлі» (2003), «Завіруха кропель» (2004), «Каліва» (2005), «Кветка ў мегаполісе» (2006), «Дар зямны» (2007), «Весніцы» (2008), «Світальныя словы» (2009), «Ляці вышэй!» (2014), «Вітаю цябе, Натхненне!» (2015), «Жыву» (2017), «Апошні дзень лета…» (2019). Творы «БУКетаўцаў» неаднаразова друкаваліся і друкуюцца ў газетах «Літаратура і мастацтва», «Наша слова», у часопісах «Маладосць», «Літаратурны квартал», «Альфабэт», «Верасень».

Удзельнікі аб'яднання прадстаўляюць сваю творчасць на ўніверсітэцкіх, рэспубліканскіх і міжнародных літаратурных конкурсах («Фестываль аднаго верша», «Песня натхнення», «Жураўлі над Расіяй», Міжнародны конкурс рускамоўнай паэзіі ў Рыме), становяцца лаўрэатамі і пераможцамі. Найбольш паспяховымі для літаб'яднання былі конкурсы талентаў універсітэта «Сем муз» (2008; пераможца – В. Яцэвіч); міжнародны «Созвучие слов живых» (2009; В. Злотнікава заняла I месца ў секцыі «Паэзія»). Сябры «БУКета» прымалі ўдзел у «паэтычных баях» (слэмах), якія ладзіліся ў г. Мінску (2009), у іх ліку А. Шостак (адзін з пераможцаў), Г. Белагурцава, Ю. Храмцова. У журы слэмаў уваходзілі вядомыя беларускія пісьменнікі Л. Рублеўская, П. Васючэнка, В. Жыбуль, В. Шніп, А. Камоцкі, Г. Матэвасян і інш. У такіх паэтычных спаборніцтвах важнае значэнне маюць змест твора, уменне выразна і эмацыянальна чытаць, каб данесці думку верша да слухачоў. У студзені 2011 г. удзельнікі аб'яднання «БУКет» прадставілі сваю творчасць на паэтычных конкурсах «Фестываль аднаго верша» (праводзіцца па ініцыятыве аддзела паэзіі літаратурнага партала «Точка зрения») і «Песня натхнення» (арганізатар – Дзяржаўны літаратурна-мемарыяльны музей Якуба Коласа). У лік фіналістаў і прызёраў абодвух конкурсаў увайшлі В. Гронская і А. Емяльянаў.

На II Міжнародным конкурсе песенна-паэтычнай творчасці «Жураўлі над Расіяй» (2011), арганізаваным Маскоўскім дзяржаўным універсітэтам культуры і мастацтваў, кіраўнік літаратурнага аб'яднання «БУКет» П. Макееў атрымаў дыплом I ступені ў намінацыі «Жыві і помні, мая Расія» за аўтарскія вершы пра подзвіг народаў у Вялікай Айчыннай вайне.

Былыя ўдзельнікі аб'яднання А. Шостак, В. Бялова і інш., цяпер ужо выпускнікі БДУКМ, сталі членамі Саюза пісьменнікаў Беларусі (СПБ), перамагаюць у міжнародных паэтычных конкурсах. Так, А. Вайцяшонак стала дыпламантам VI Міжнароднага конкурсу маладых рускамоўных паэтаў замежжа «Вецер падарожжаў» (2011).

У паэтычна-музычным конкурсе ў гонар юбілею славутага беларускага паэта М. Багдановіча (2011) удзельнічалі сябры творчай суполкі К. Балацько, П. Макееў, К. Нарваткіна, М. Бельская, У. Фалітарык.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

На ўрачыстай вечарыне, прысвечанай 125-годдзю з дня нараджэння М. Багдановіча (2016; арганізатары – прафесар В. С. Варапаева і П. Ю. Макееў), выкладчыкі і студэнты розных факультэтаў універсітэта і «БУКетаўцы» ўзгадвалі сваё знаёмства з творчасцю паэта, дэкламавалі вершы, спявалі песні на словы М. Багдановіча. Вершы чытаў і сённяшні Міністр культуры Рэспублікі Беларусь, былы рэктар універсітэта Ю. П. Бондар. Чытанне вершаў М. Багдановіча дэманстравалася на плазменнай панэлі ў фае ўніверсітэта падчас вялікага перапынку.

Дацэнт кафедры В. Ч. Гронская стала пераможцам літаратурнага спаборніцтва «Конкурс аднаго верша» (2013), які праходзіў у Дзяржаўным літаратурным музеі Янкі Купалы (сярод удзельнікаў была студэнтка БДУКМ К. Нарваткіна).

У межах аб'яднання «БУКет» да 70-годдзя Вялікай Перамогі (2015) праведзены конкурс, у якім удзельнічалі студэнты ўсіх факультэтаў універсітэта, на лепшы твор пра Вялікую Айчынную вайну. Пераможцамі сталі Г. Вярэніч (ФІДК), Г. Пуйдак (ФММ), К. Ерашова (ФІДК), К. Шпадарук (ФММ).

Да 500-годдзя беларускага кнігадрукавання (выданне першай друкаванай кнігі Францыска Скарыны «Псалтыр») у маі 2017 г. быў арганізаваны конкурс на лепшы мастацкі твор. Пераможцамі ў намінацыях «Лепшы твор па-беларуску», «Лепшы твор па-руску» сталі студэнткі факультэта ФІДК В. Брэк і Г. Вярэніч.

Удзельнікі літаратурнага аб'яднання як творчыя асобы з цікавасцю ставяцца не толькі да выдання зборнікаў твораў, але і іх прэзентацыі, іншых мерапрыемстваў, арганізаваных на факультэце, ва ўніверсітэце, з'яўляюцца ініцыятарамі імпрэз, вечарын. «БУКетаўцы» актыўна ўдзельнічаюць у святкаваннях «ТыДня роднай мовы», Дзён ФІДК, Дзён славянскага пісьменства і культуры ў Рэспубліцы Беларусь і іншых культурных мерапрыемствах. Самыя значныя і цікавыя імпрэзы збіралі вялікія аўдыторыі гледачоў-аднадумцаў.

Тэатральная пастаноўка па матывах аповесці «Ладдзя роспачы» з глыбокім экскурсам у паэзію была прымеркавана да юбілею славутага беларускага пісьменніка У. Караткевіча (2010). Сцэнарый і канцэпцыя імпрэзы належыць В. Гронскай і студэнткам ФТБКіСМ К. Цынскай і А. Зміцер. У пастаноўцы былі заняты К. Балацько, С. Гуляшоў, А. Емяльянаў, Я. Ляцко, П. Макееў, У. Фалітарык, В. Гронская. Варта адзначыць, што важнасць такіх творчых сустрэч маладых аўтараў з класікамі праз успрыманне літаратурных твораў, іх тэатралізаваную інтэрпрэтацыю ў тым, што студэнты назапашваюць вопыт, выяўляюць і дэманструюць літаратурныя і іншыя творчыя здольнасці.

На літаратурна-мастацкай вечарыне «Дыялог паэтаў: руская паэзія ў беларускіх перакладах, беларуская паэзія ў рускіх перакладах» (май

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

2012), прысвечанай Дню славянскага пісьменства і культуры і Году кнігі ў Рэспубліцы Беларусь, удзельнікі «БУКета» выступілі з паэтычнай праграмай. Арганізатарамі сустрэчы былі Расійскі цэнтр навукі і культуры ў Мінску і БДУКМ. Змястоўны сцэнарый вечарыны, прысвечанай 130-годдзю Янкі Купалы і Якуба Коласа, «Песня на сон у бяссонне» (снежань 2012) падрыхтавалі В. Гронская і П. Макееў.

Для творчага аб'яднання «БУКет» і яго кіраўніка П. Ю. Макеева 2014 год быў вельмі адказны. Выкладчыкі кафедры беларускай філалогіі і сусветнай літаратуры В. Гронская і В. Шунейка былі арганізатарамі выніковага канцэрта, прысвечанага Дню роднай мовы (сярод запрошаных выступаў паэт Л. Дранько-Майсюк).

Гурткоўцы неаднаразова прымалі ўдзел у літаратурна-музычных вечарынах. Яркімі і запамінальнымі былі літаратурная імпрэза «Слова – усяго аснова. Душа крылатая ў слова» (сакавік 2015), прысвечаная творчасці Р. І. Барадуліна, і вечар, прымеркаваны да 85-годдзя з дня нараджэння У. Караткевіча «Быў. Ёсць. Буду…» (лістапад 2015), дзе гучалі вершы, песні на яго словы, адбылася тэатральная пастаноўка казкі і ўрыўка з аповесці, дэманстраваліся літаратурна-музычныя кампазіцыі.

«БУКетаўцы» традыцыйна прымаюць удзел у святкаванні Дня ФІДК, дзе прадстаўляюць свае markerзнатэматычныя творы з глыбокім падтэкстам і арыгінальным выкананнем. У 2010 г. па даручэнні кіраўніцтва факультэта літаб'яднаннем была арганізавана сустрэча з амерыканскім паэтам Маркам Смітам, заснавальнікам творчага руху «Слэмавай паэзіі». Члены «БУКета» Г. Асадчая, Я. Ляцко, В. Мажэйка, П. Макееў наведалі спаборніцтва па «слэмавай паэзіі», якое праводзілася ў Мінску пад эгідай амбасады ЗША. Фінальны раўнд конкурсу ў складзе журы ацэньваў П. Макееў.

У 2016 г. кафедра святкавала 15-годдзе літаб'яднання «БУКет». Маладыя літаратары дзяліліся творчымі набыткамі: чыталі ўласныя вершы і прозу, спявалі песні. На сустрэчы прысутнічалі ўдзельнікі літаратурнага жыцця «БУКета» розных гадоў – Н. Смерцева, К. Сідарук, А. Шостак, Я. Дашкоў, К. Балацько, К. Нарваткіна, А. Бабко, П. Макееў, А. Пісарэнка, В. Шунейка, В. Гуліцкая і інш. Павіншавалі малады калектыў літаратараў паэт, кіраўнік літаб'яднання «Крокі» МДПУ імя М. Танка М. Шабовіч, паэт, празаік, кампазітар Д. Пятровіч, а таксама адзін з заснавальнікаў гуртка Н. Якавенка. Вядучая вечарыны В. Варапаева перадала віншавальныя словы ад М. А. Мажэйкі і Л. І. Даніленкі.

Падчас паэтычных конкурсаў і пасяджэнняў «БУКетаўцы» чытаюць не толькі ўласныя творы, але і іншых аўтараў, напрыклад чылійскага паэта Карласа Касасуса (май 2017). У свята Дня маці на ФІДК яны арганізавалі сустрэчу з пісьменніцай В. Паліканінай (кастрычнік 2017).

Стала традыцыяй падчас «ТыДня роднай мовы» запрашаць выпускнікоў аб'яднання, членаў Саюза пісьменнікаў Беларусі. Так, на су-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

стрэчы гурткоўцаў (2016) з рэдактарам часопіса «Полымя» А. Шостакам адбыўся канструктыўны дыялог. Адам Шостак дзяліўся літаратурным вопытам, студэнты – цікавымі ўласнымі здабыткамі ў паэзіі і прозе, а кансультанты «БУКета» (А. М. Пісарэнка, В. С. Варапаева, І. М. Мантачык) прааналізавалі беларускія тэксты.

У верасні 2016 г. члены «БУКета» прынялі ўдзел у Дні беларускага пісьменства, прымеркаваным да юбілеяў волатаў беларускага паэтычнага слова – Н. Гілевіча і Г. Бураўкіна, а ганаровымі гасцямі сталі славутыя беларускія кампазітары І. Лучанок, Э. Ханок.

У 2017 г. гурткоўцы ўдзельнічалі ў імпрэзе, прымеркаванай да 135-годдзя з дня нараджэння заснавальнікаў сучаснай беларускай літаратурнай мовы – Янкі Купалы і Якуба Коласа, дзе быў праведзены конкурс «Чытаем Коласа ўголас».

«БУКетаўцы» арганізоўваюць і паэтычныя калядкі, на якіх студэнты розных факультэтаў спяваюць зімовыя песні, чытаюць уласныя творы і іншых аўтараў. Найбольш запамінальны з такіх вечароў прайшоў у снежні 2017 г.

Творчая актыўнасць гурткоўцаў і студэнтаў адзначана на паэтычным вечары, прымеркаваным да Сусветнага дня паэзіі (2019), дзе гучалі любімыя творы.

Да 40-гадовага юбілею Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў у 2015 г. быў укладзены і падрыхтаваны да друку (А. М. Пісарэнка, В. В. Шунейка, пры падтрымцы П. Макеева) зборнік паэтычных і празаічных твораў «Вітаю цябе, Натхненне!». Спецыяльна запрошаным госцем на прэзентацыі зборніка быў кампазітар, спявак, кіраўнік тэатра спорту і песні «Дэльта-шоу», арганізатар і капітан футбольнай каманды зорак беларускай эстрады «Арт-Старс» – Альберт Скараход, рэкардсмен «Кнігі рэкордаў Гінеса» (2006).

Прэзентацыя чарговага зборніка літаратурнага аб'яднання «БУКет» (2018) адбылася ў аўдыторыі імя У. Мулявіна. На ёй прысутнічалі, акрамя студэнтаў, выкладчыкаў, госці ўніверсітэта, у ліку якіх члены СПБ – суаўтары кнігі «Жыву».

У зборнік мастацкіх твораў «Апошні дзень лета...» (2019), падрыхтаваны загадчыкам кафедры беларускай і замежнай філалогіі, прафесарам А. М. Пісарэнка і старшым выкладчыкам В. В. Шунейка, былі ўключаны творы ўдзельнікаў літаратурна-творчага аб'яднання «БУКет». Сярод яго аўтараў члены СПБ: выпускнікі ўніверсітэта А. Шостак, В. Герасімаў, Ю. Лаўрык, Ю. Максіменка і паэты М. Шабовіч, Д. Пятровіч. Такі россып талентаў яшчэ не давялося бачыць у нашых кнігах.

Многія «БУКетаўцы» друкуюцца за межамі ўніверсітэцкіх выданняў, што з'яўляецца важным крокам у прапагандзе творчага іміджу Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Найбольш значнымі з'яўляюцца публікацыі ў рэспубліканскіх выданнях, выступленні на беларускім радыё: С. Канановіч стварыла рубрыку «Літаратурны хутарок» у Лагойскай раённай газеце (у якой выступала і як аўтар вершаў), друкавалася ў «Весніцах» (2008); вершы ўдзельнікаў аб'яднання ўвайшлі ў збор твораў «Маладая паэтычная Беларусь» (2009), выданне якога адбылося пры СПБ; у кастрычніку 2010 г. удзельнікі «БУКета» К. Балацько, Я. Казлоўская, Я. Ляцко, В. Мажэйка, П. Макееў, Ю. Храмцова выступалі са сваімі творамі на радыё «Культура»; у газеце «ЛіМ» публікаваліся вершы П. Макеева, К. Нарваткінай, апавяданне студэнткі Г. Балаш-Елейнікавай. Дарэчы, у 2019 г. Г. Балаш-Елейнікава (ФТБКіСМ) удзельнічала ў конкурсе пры СПБ і стала лаўрэатам у намінацыі «Лепшы празаічны твор»; у часопісе «Бібліятэчны свет» змешчаны нізкі вершаў, прысвечаныя Году малой радзімы, сённяшніх студэнтаў і выпускнікоў: А. Тарасавай (ФІДК), В. Аляксандрава (ФТБКіСМ) і А. Пінчука (ФТБКіСМ), вершаў А. Лукшыца; Г. Балаш-Елейнікава стала ініцыятарам і складальнікам «Паэтычнага календара», у якім для кожнага месяца былі падабраны вершы маладых аўтараў, аздобленыя ўласнымі фотаздымкамі родных краявідаў (2019).

Яшчэ адным кірункам дзейнасці літаратурнага аб'яднання стала супрацоўніцтва з СПБ. У розныя часы пасяджэнні «БУКета» ці мерапрыемствы, арганізаваныя кіраўнікамі і ўдзельнікамі, наведалі розныя аўтары: Г. Марчук, А. Зэкаў, Л. Рублеўская, А. Дудараў, М. Шабовіч, Д. Пятровіч, Т. Сівец, М. Пазнякоў, Л. Дранько-Майсюк, В. Шніп, В. Жыбуль і інш. Сярод запрошаных гасцей былі выпускнікі ўніверсітэта (члены СПБ) Я. Лайкоў, А. Свечнікава, А. Шостак, В. Бялова.

Паэт Я. Лайкоў загадваў аддзеламі прозы і паэзіі ў штотыднёвіку «Літаратура і мастацтва» (2004–2009), крытыкі ў часопісе «Маладосць» (2010), з'яўляецца аўтарам паэтычных зборнікаў «Логіка пасткі» (2000), «Вогнепаклоннік» (2003) і інш. Друкаваўся таксама ў паэтычных зборніках літаратурнага аб'яднання: «БУКет» (2002), «Вітаю цябе, Натхненне!» (2015), «Жыву» (2017), «Апошні дзень лета…» (2019). Яго творчасць вызначаецца тонкім адчуваннем свету, філасофскім асэнсаваннем жыццёвых рэалій, экспрэсіўным пераасэнсаваннем звычайных з'яў у літаратурныя вобразы і багаццем маўлення: *Змярканне лепіць цень да столі. / Малы, цягнуся, каб схапіць / ружовы бохан спелай поўні, / на срэбры пальцы сашчапіць; Я шукаў сябе ў тых далёкіх днях, / калі дом ссамотнелы спавівалі замеці, / калі памяць гублялася ў снах, / калі сны губляліся ў памяці.*

Паэт, літаратурны крытык А. Свечнікава (член СП Беларусі і Расіі) з'яўляецца аўтарам кніг «Паэтыка пародыі і не толькі…» (1998) і «Слова» (2009), суаўтарам кнігі «е2: паэзія» (2016). Ажыццёўленыя ёю пераклады вершаў А. Пісарыка ўвайшлі ў кнігі «У памяці гадоў» (2004), «Мая

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

малітва» (2013), празаічных твораў Я. Лаўцюса (з літоўскай мовы) у кнігу «Дэпрэсія – мая госця» (2013). Вершы А. Свечнікавай можна знайсці ў васьмі з выдадзеных літаб'яднаннем зборніках. Вытанчаны аўтар, з адметным своеасаблівым светаўспрыманнем, яна то іранічна ўсміхаецца з розных праяў і з'яў жыцця, то ціха сумуе над няспраўджаным, то аптымістычна імкнецца ў новыя светавобразы: *Осенний свет на липах тает, / Сороки ветер теребят. / И дворник медленно сметает / Опавший шорох бытия; Когда кропаю понемножку / Стихи – по поводу и без – / Кошусь, чтоб рядом не крутился / Дантес.*

А. Шостак, з'яўляючыся навуковым супрацоўнікам Нацыянальнага мастацкага музея Рэспублікі Беларусь, займаецца літаратурай, пераважна паэзіяй, а таксама мастацтвам перформансу. Аўтар зборнікаў: літаратурнага «Спатканне Не» (2006) і паэтычнага «4.33» (2012). Падчас вучобы ў БДУКМ ён быў актыўным членам літаратурнай суполкі. Прымаў удзел у фестывалях «Адсутнае беларускае мастацтва» (2008) у Санкт-Пецярбургу, дзе выступіў з уласнымі вершамі, і ў Міжнародным паэтычным «Парадак словаў» (2008, Мінск); друкаваўся ў «Маладосці», «ЛіМе» і інш. рэспубліканскіх выданнях; выступаў з вершамі ў перадачы «Маладзёжны квартал», на Белрадыёканале «Культура»; удзельнічаў у афармленні насценгазеты, якая выдавалася гурткоўцамі і інш. А. Шостак – актыўны аўтар нашых літаратурных зборнікаў (друкаваўся ў васьмі з іх). Паэзія А. Шостака спецыфічная, адметная формай і зместам: загадкавы аўтар, ён паэтызуе непаэтычнае, выкрывае штучнае, несапраўднае, што замінае чалавеку быць асобай. Тое, што на першы погляд здаецца без формы, без знакаў прыпынку, без зместу, мае гармонію, глыбіню… Як бязладдзе самога жыцця пераўтвараецца ў зладжаны рух, калі не бегчы, не мітусіцца, а калі спыніцца, услухацца, то ёсць шанец убачыць сваё, знайсці сябе: *сарваныя травы / размінаю пальцамі / ствараю букет пахаў // рукі заўжды / цёмна-зялёныя / водар гаркавы // у букеце маім / заўжды палын; Пабачыць Пізанскую вежу… / Даждж б'юць струменні па твары; / і поруч з табою пакрочыць, / і сіверам-холадам дыхаць / у гэтым мястэчку між ночы; Вялікімі зрэнкамі / глядзіш у вялікае неба. // Чужымі памылкамі / спасцігаеш недасканаласць.*

Паэт, драматург В. Бялова з'яўляецца аўтарам кніг «Счастье», «29» і інш. Вучоба ў БДУКМ па спецыяльнасці «літаратурная работа» (спецыялізацыя «тэатральная драматургія») спрыяла яе навуковым і творчым дасягненням. Ужо ў 2008 г. адбыліся выступленне перад гурткоўцамі «Візуальная, ці эксперыментальная, паэзія», прэзентацыя зборніка «Весніцы», прэм'ера спектакля паводле яе казкі «Прыгоды Заранкі і Янкі» ў Беларускім драматычным тэатры імя Янкі Купалы. Вершы В. Бяловай былі надрукаваны ў сямі зборніках літаратурнага аб'яднання. Паэзія В. Бяловай – гэта белы саматканы абрус, чысты і светлы, як душа паэтэсы: яна вышывае на гэтым абрусе рознымі фарбамі,



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

якія, па яе словах, вынайшла ва ўніверсітэцкім «БУКеце»: то ставіць на абрус вазу з кветкамі кахання, то ідзе па ім гуллівай жанчынай-коткай ці ўвогуле сумуе ў апошні дзень лета. Яна сама тчэ ў паэзіі і ў жыцці свой лёс: *Руки невкусно пахнут / чесноком и котлетами. / Бросить всё. К морю! / Завтра. / Завтрак. / Последний день лета. // Белые скатерти сохнут. / Астры. Ваза. Конфеты. / Забросить мечты. / Умоюсь / бытом, слезами, / рассветом. / После. / Последний день лета; Не задавай глупых вопросов, / если заранее знаешь ответ. / В наших с тобой отношениях – / осень. / Давай переждём дождливый / рассвет?..*

Адным з выдатных аўтараў сучаснасці ў Беларусі з'яўляецца Андрэй Федарэнка, выпускнік факультэта інфармацыйна-дакументных камунікацый БДУКМ. Яго творы перыядычна сустракаюцца на старонках «БУКетаўскіх» зборнікаў. А. Федарэнка – філосаф, яго проза ў прозе (класічная проза!), напісаная сакавітай беларускай мовай, расплюшчвае вочы сучаснікаў, раскрывае іх сэрцы, бо не можа ёмкае быць пустым у сапраўднага мастака слова.

Выпускнік нашага ўніверсітэта (ФТБКіСМ) іераманах Яўстафій (Юры Халіманкоў) з'яўляецца суаўтарам нашых выданняў. Ён займаецца перакладамі Бібліі, літаратурнай творчасцю ў прозе. Проза іераманаха Яўстафія псіхалагічная, глыбокая; ён ідзе да спасціжэння свету праз душу, праз сэрца, што кожнага можа прывесці да ачышчэння, да слова Божага.

Майстар-класы, якія праводзяцца на сустрэчах «БУКетаўцаў», асабліва карысныя для маладых аўтараў, паколькі ўзаемадзеянне талентаў спрыяе творчаму росту, натхняе на стварэнне новых твораў, выхоўвае ашчаднае стаўленне да слова, асобы, свету і спрыяе адметнаму творчаму асэнсаванню з'яў і рэалій жыцця.

За 19 гадоў «БУКет» вырасціў больш за 200 аўтараў. Удзельнікі літаратурнага аб'яднання карпатлівай працай шліфуюць талент. І сённяшнія маладыя аўтары К. Бандзерс, Г. Вярэніч, В. Рудакоўская, І. Кравец, У. Сергіенка, С. Бабранок, М. Новікава, В. Брэк, В. Міхайлаў, Г. Балаш-Елейнікава, А. Балкоўскі, С. Марцінкевіч, В. Аляксандраў, К. Бакулін, А. Краснікаў і інш. плённа шчыруюць на літаратурнай ніве.

Літаратурна-творчае аб'яднанне «БУКет» працягвае актыўную творчую дзейнасць па пошуку новых талентаў, новых форм работы з прыцягненнем прадстаўнікоў іншых творчых аб'яднанняў у якасці назіральнікаў і крытыкаў. Удзельнічаючы ў конкурсах, фестывалях, радыёперадачах, маладыя аўтары робяць шмат для таго, каб мастацкае слова жыло, было, расло і каб «БУКет» расквеціўся рознымі фарбамі ва ўсіх рэгіёнах Беларусі.

Кіраўніцтва «БУКета» не губляе стасункаў з выпускнікамі, таму колькасць аўтараў (кветак «БУКета») расце ад зборніка да зборніка.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*З нейкім новым трапяткім пачуццём гартаю,*
*чытаю старонкі твораў, творчасці, тварэнняў,*
*стварэнняў маладых аўтараў.*
*Услухоўваюся ў гукі, учытваюся ў словы, углядаюся ў вобразы…*
*Раней баялася, каб не прапусціць памылкі,*
*арфаграфічныя ці пунктуацыйныя,*
*каб не сказіць сэнс слоў і выразаў…*
*Мудрэю…*
*Баюся, каб не прапусціць*
*цікавы вобраз, арыгінальную думку,*
*адметны твор.*

*А. Пісарэнка*

*A. Pisarenko*

**From a sprout to "Bouquet":**
**historiography of the University's literature association**

*The article is dedicated to one of the most pressing problems in the field of today's education: identification of the talented youth, as well as development and improvement of their creative potential in literary activity. The 19-years' experience of Bouquet, the University's literary association, is compiled and analyzed. Literary work is one of the ways of the reality cognition and a means of self-expression of one's individuality through artistic images. The article refers to the publications of the association members' works of a poetic, prosaic and dramatic nature, describes students' participation in literary competitions held at the university, republic and international levels.*

Дата паступлення артыкула ў рэдакцыю: 13.04.2020.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ